ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі ўніверсітэт



№ 18(956) | АЎТОРАК, 15 снежня 1998 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## НА САВЕЦЕ УНІВЕРСІТЭТА

24 лістапада адбылося перадапошняе ў бягучым годзе пасяджэнне Савета універсітэта. Асноўным на парадку яго дня было пытанне аб рабоце культурнага цэнтра па духоўна-эстэтычнаму выхаванню студэнтаў. Заслуханы і абмеркаваны даклад прарэктара па культурна-асветніцкай рабоце А.В.Лысянкова. У прынятай пастанове дзейнасць цэнтра ацэнена станоўча. Адначасова прадугледжаны меры па ўдасканаленні праводзімай у гэтым напрамку. работы.

Па інфармацыі прарэктара па навуковай рабоце прафесара Д.Р.Ліна найбольш вопытным кандыдатам навук дазволена кіраўніцтва аспірантамі.

Савет разгледзеў кадравыя пытанні. Доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар кафедры тэарэтычнай фізікі А.М.Сердзюкоў абраны загадчыкам кафедры оптыкі. Прафесарам гэтай жа кафедры абраны доктар фізіка-матэматычных навук Г.С.Міцюрыч.

Кандыдат біялагічных навук В.М.Храмчанкова абрана на конкурсу на пасаду загадчыка кафедры батанікі і фізіялогіі раслін. На пасаду старшага выкладчыка кафедры фізічнага выхавання і спорту выбрана Т.Я.Магілёўцава, а на пасады асістэнтаў кафедры педагогікі – С.А.Вальчанка і І.Т.Зайцава.

## НАДЗЕЯ ЗАЎТРАШНЯГА ДНЯ

Псіхалагічная дапамога людзям у сённяшніх складаных эканамічных і сацыяльных умовах, і асабліва ў рэгіёнах, якія закранула чарнобыльская бяда, неабходна вельмі востра. Пяць гадоў назад пачалася карпатлівая і мэтанакіраваная работа па стварэнні псіхалагічнай службы на Гомельшчыне сіламі Нацыянальнай акадэміі Сацыяльнай дапамогі (АНПАС), італьянскіх вучоных з г.Пізы, ГДУ імя Ф.Скарыны, а таксама дабрачыннага фонду "Дапамога дзецям Чарнобыля". І зараз можна сцвярджаць: беларуска-італьянская праграма паспяхова рэалізоўваецца. Вядзецца падрыхтоўка практычных псіхолагаў з ліку студэнтаў педагагічных спецыяльнасцей ГДУ, слухачоў факультэта павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў, дырэктараў школ-інтэрнатаў, дзіцячых дамоў. У ГДУ адкрыта новая спецыяльнасць – "Псіхалогія". А нядаўна адбылася знамянальная падзея, якая падсумавала тую значную работу, якая вялася дагэтуль: у ГДУ адкрыта лабараторыя практычнай псіхалогіі – другая па ліку ў нашай рэспубліцы (адна ўжо дзейнічае ў Мінскім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя М.Танка).

Усе гэтыя гады падрыхтоўка кадраў псіхолагаў вялася з дапамогай і пры непасрэдным удзеле вялікага энтузіяста — дырэктара дэпартамента псіхолагаў, прафесара універсітэта г.Пізы Гаэтана Барлета. Яго шматлікія прыезды да нас з Італіі для



чытання лекцый па псіхалогіі студэнтам можна без перабольшвання назваць подзвігам. І стварэнне лабараторыі практычнай псіхалогіі адбывалася пры самым актыўным яго ўдзеле. Таму так высока і была ацэнена яго падзвіжніцкая дзейнасць ва універсітэце: на ўрачыстым пасяджэнні Савета ГДУ рэктар член-карэспандэнт НАН Рэспублікі Беларусь Л.А.Шамяткоў уручыў Гаэтана Барлета Дыплом аб прысваенні яму ганаровай ступені доктара псіхалогіі Гомельскага дзярж-універсітэта імя Ф.Скарыны (**на здымку**). Італьянскі вучоны выказаў шчырую ўдзячнасць і адзначыў, што гэта прызнанне не толькі яго асобы, але і італьянскага народа, яго культуры, якія ён прадстаўляе. Ён глыбока перакананы ў тым, што жыццё мае асаблівы сэнс, калі прызнаюцца каштоўнасці чалавека, і калі гэтыя каштоўнасці можна падзяліць з іншымі. Дзеля гэтага ён і прыязджае ў Гомель, на радзіму сусветна вядомага псіхолага Л.С.Выгоцкага, дзе нараджаюцца выдатныя традыцыі ў галіне псіхалагічных даследаванняў.

Ва ўрачыстым пасяджэнні Савета прымалі ўдзел старшыня гарвыканкома А.С.Якабсон, які высока ацаніў работу па падрыхтоўцы псіхалагічных кадраў для Гомельшчыны, кіраўнік адміністрацыі Цэнтральнага раёна У.І.Дзервянкоў, а таксама старшыня фонду "Дзеці Чарнобыля" Г.В.Карэцкі. Ён, у прыватнасці, падкрэсліў рашаючую ролю італьянскага вучонага па наладжванні сумеснай праграмы па аздараўленні дзяцей з чарнобыльскай зоны і падрыхтоўкі для дзіцячых дамоў кадраў псіхолагаў.

Добрая справа заўсёды знойдзе свой працяг. Актыўная дзейнасць Г.Барлета як вучонага-псіхолага не абмяжоўваецца толькі г.Гомелем. Дзелавыя кантакты наладжаны ім і з факультэтам прыкладной

**(ЗАКАНЧЭННЕ на 2-й стар.)**

*З IV пленума БРК галіновага прафсаюза*

## НА АБАРОНЕ НАШЫХ ПРАВОЎ

Фінансава-эканамічны крызіс закрануў практычна ўсе слаі насельніцтва. Работнікі адукацыі і навукі — не выключэнне. Пацвярджаюць гэта лічбы: за апошнія пяць гадоў узровень дабрабыту работнікаў сістэмы адукацыі пагоршыўся амаль у тры разы, не забяспечваецца выкананне пагаднення аб паэтапным набліжэнні сярэдняй заработнай платы работнікаў адукацыі да сярэдняй заработнай платы ў прамысловасці. Наадварот, разрыў павялічваецца.

Што рабіць у такой складанай сённяшняй сітуацыі дзеля абароны сваіх членаў прафсаюза? Аб гэтым ішла гаворка на IV пленуме Беларускага рэспубліканскага камітэта галіновага прафсаюза, які адбыўся ў г.Гомелі ў канцы мінулага месяца. На ім з дакладамі выступілі старшыня БРК прафсаюза Т.І.Чобатава і старшыня Гомельскага абкома прафсаюза У.Я.Курылаў. У рабоце пленума прымалі ўдзел намеснік старшыні МАПОУ В.М.Бярэзін, намеснік міністра адукацыі рэспублікі А.І.Купцоў, старшыня аб'яднання прафсаюзаў Гомельскай вобласці А.В.Кабанец, намеснік старшыні аблвыканкома У.У.Давідовіч.

Пленум прыняў пастанову, накіраваную на абарону працоўных, сацыяльна-эканамічных і прафсаюзных правоў работнікаў галіны, адзначана ў ёй і рэзультатыўная работа прафкома студэнтаў ГДУ па арганізацыйнаму ўмацаванню прафсаюза, развіццю сацыяльнага партнёрства з органамі ўпраўлення адукацыі.

Удзельнікі пленума прынялі Зварот да Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнкі, у якім з болем і заклапочанасцю сканцэнтравалі ўвагу на той надзвычайнай сітуацыі, якая склалася ў аплаце працы, матэрыяльна-прававой абароне работнікаў сістэмы адукацыі.

Члены пленума БРК галіновага прафсаюза наведалі і наш універсітэт, дзе азнаёміліся з пастановкай работы прафкомаў ГДУ па сацыяльнай абароне членаў прафсаюза, сацыяльнага партнёрства прафсаюзных камітэтаў і адміністрацыі, лячэбнай і аздараўленчай базай для студэнтаў. Для іх былі наладжаны экскурсіі ў музей Ф.Скарыны, лабараторыю лазернай оптыкі.

## ПА ПРАБЛЕМАХ ВЫХАВАННЯ МОЛАДЗІ

Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь, Міністэрства адукацыі, Дзяржкаміт па справах моладзі, БПСМ, Беларускае навукова-педагагічнае таварыства правялі ў Цэнтральным Доме афіцэраў рэспубліканскую навукова-практычную канферэнцыю "Выхаванне моладзі ў духу грамадзянскасці, патрыятызму і гатоўнасці да воінскай службы". Ад нашага універсітэта ў яе рабоце прыняў удзел прарэктар па вучэбнай і выхаваўчай рабоце М.М.Воінаў.

## ДЫСЕРТАЦЫІ АБАРАНЯЛІ ФІЛОЛАГІ

Пасля стварэння спецыялізаванага Савета па абароне кандыдацкіх дысертацый па мовазнаўству пры нашым універсітэце адбылося яго чацвёртае пасяджэнне. На гэты раз першым абараняў дысертацыю на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук аспірант доктара філалагічных навук, прафесара кафедры беларускай мовы ГДУ, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь У.В.Анічэнкі Р.У.Серыкаў. Яго даследаванне прысвечана лексічнай стылістыцы Я.Купалы.

Афіцыйнымі апанентамі саіскальніка на атрыманне вучонай ступені выступілі доктар філалагічных навук з Інстытута мовазнаўства імя Я.Коласа НАН Беларусі Л.Ц.Выгонная і загадчык кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання Белдзяржуніверсітэта В.І.Іўчанкаў.

Р.У.Серыкаў абараняў дысертацыю з глыбокім веданнем тэарэтычнага курса і даследуемага матэрыялу. Члены спецыялізаванага Савета аднагалосна прагаласавалі за прысуджэнне яму вучонай ступені.

У гэты ж дзень паспяхова абараніла кандыдацкую дысертацыю і асістэнт кафедры беларускай мовы А.М.Шубадзёрава з Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А.А.Куляшова.

**(Наш кар.)**

## ЮБІЛЕІ, ЮБІЛЕІ...

Старэйшай педагагічнай вышэйшай навучальнай установе Беларусі – Віцебскаму дзяржаўнаму універсітэту імя П.М.Машэрава споўнілася 85 гадоў. З гэтай нагоды тут адбыліся святочныя ўрачыстасці. Ад нашага універсітэта ў іх прыняў удзел прарэктар па навуковай рабоце, прафесар Д.Р.Лін. Ад калектыву ГДУ ён уручыў юбілярам прывітальны адрас і памятны падарунак.

* * *

3-га снежня сваё 80-годдзе адзначыў Магілёўскі дзяржаўны універсітэт імя А.А.Куляшова. Яго калектыву прывітальны адрас і памятны падарунак ад ГДУ ва ўрачыстай абстаноўцы ўручыў рэктар, член-карэспандэнт НАН Беларусі Л.А.Шамяткоў.

* * *

Мінула 50 гадоў, як рыхтуе высокакваліфікаваныя кадры па замежных мовах Мінскі лінгвістычны універсітэт. У яго адрас таксама накіраваны віншаванні і цёплыя пажаданні ад калектыву нашага універсітэта.

* * *

Наш універсітэт уваходзіць у зону абслугоўвання паліклінікі №6 г.Гомеля, пасля адкрыцця якой прайшло 55 гадоў. Ва ўрачыстасці, якая прайшла з нагоды гэтай даты, прыняў удзел старшыня прафкома Г.І.Варатніцкі. Ад імя рэктарата, грамадскіх арганізацый, выкладчыкаў, супрацоўнікаў, аспірантаў і студэнтаў ён уручыў калектыву медыцынскай установы прывітальны адрас і кветкі.

## З УЗНАГАРОДАЙ!

*За шматгадовую плённую навукова-педагагічную дзейнасць і ў сувязі з 50-годдзем з дня нараджэння Ганаровай граматай аблвыканкома ўзнагароджаны МАЛАШЧАНКА Аляксей Цярэнцьевіч – старшы навуковы супрацоўнік навукова-даследчага сектара.*

*З гэтай жа нагоды МАЛАШЧАНКА Аляксей Цярэнцьевіч ўзнагароджаны таксама Ганаровай граматай універсітэта.*

*За шматгадовую плённую навуковую і вучэбную работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці і ў сувязі з 50-годдзем з дня нараджэння асістэнт кафедры ВМ і праграміравання БАГДАНАВА Таццяна Рыгораўна ўзнагароджана Ганаровай граматай універсітэта.*

# НАДЗЕЯ ЗАЎТРАШНЯГА ДНЯ

(ЗАКАНЧЭННЕ. ПАЧАТАК на 1-й стар.)

псіхалогіі Мінскага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя М.Танка. Таму не выпадкова на знамянальную падзею ў г.Гомель прыехалі дэкан названага факультэта С.І.Копцева і загадчыца кафедры практычнай псіхалогіі В.І.Слядкова. У навучальнай установе, дзе яны працуюць, не першы год вядзецца падрыхтоўка студэнтаў, якія вывучаюць дынамічную псіхалогію, і хутка атрымаюць ступень бакалаўра. У гэтым навучальным працэсе задзейнічаны і Г.Барлета. Працуе тут і лабараторыя клінічнай псіхалогіі, адкрытая з яго ж дапамогай. Цеснае супрацоўніцтва паміж сталічнымі і гомельскімі калегамі, як адзначыла ў сваім выступленні С.І.Копцева, неабходна пагльбляць і ў будучым. Так, яны маглі б прымаць у сябе на стажыроўку гомельскіх студэнтаў.

Лагічным працягам афіцыйнай часткі сустрэчы стала адкрыццё лабараторыі практычнай псіхалогіі ГДУ, якая размяшчаецца на другім паверсе санаторыя-прафілакторыя. Чырвоную стужку перад уваходам у яе разрэзалі Л.А.Шамяткоў і Г.Барлета. Лабараторыя складаецца з некалькіх утульных пакояў, аснашчаных неабходным абсталяваннем, спецыяльнай літаратурай, набытымі таксама з дапамогай італьянскага вучонага. Шмат сіл прыкладзена тут і



У час адкрыцця лабараторыі.



калектывам кафедры псіхалогіі на чале з яе загадчыкам А.А.Лытко. Для работы з наведвальнікамі лабараторыі самых розных узростаў прадумана ўсё да дробязей: распрацаваны спецыяльныя тэсты, устаноўлена адлаведная апаратура. Кожны з пакояў носіць функцыянальны характар: для індывідуальнай і групавой тэрапіі, для дыягностыкі, пабудовы тэрапеўтычнага працэсу, для сямейнай тэрапіі, для псіхалагічнай адаптацыі першакурснікаў. Сюды можа прыйсці любы выкладчык, супрацоўнік, ці цэлая сям'я са сваімі жыццёвымі ці іншымі праблемамі, студэнт, у якога ёсць складанасці ў вучобе, у адносінах з выкладчыкамі і г.д. Тут ім акажуць патрэбную дапамогу штатны псіхолаг лабараторыі, выпускнік ГДУ У.У.Анфілаў, самі студэнты спецыяльнасці "Псіхалогія". Цяпер іх тэарэтычнае навучанне пераходзіць у практычнае рэчышча. Наведванне гэтай лабараторыі, у адрозненне ад аналагічных служб, як дзяржаўных, так і прыватных, якіх у г.Гомелі некалькі, бясплатнае.

Лабараторыя – месца эксперыментальнай работы студэнтаў – будучых псіхолагаў, якія, па словах Г.Барлета, даюць надзею ў заўтрашні дзень.

Т.ДУБЯК.
Фота У.ЧЫСЦІКА.

Кнігі нашых вучоных

# З НАВУКОВАСЦЮ І ПРАКТЫЧНАЙ НАКІРАВАНАСЦЮ

Падрыхтоўка будучых настаўнікаў ставіць мэтай іх набліжэнне да сучасных дасягненняў педагагічнай тэорыі, а таксама надзейную практычную арыентацыю на рашэнне пастаянна ўзнікаючых праблем школьнага навучання і выхавання. Менавіта гэтым патрабаванням адпавядае падручнік па педагогіцы акадэміка НАН Рэспублікі Беларусь прафесара, загадчыка кафедры педагогікі нашага універсітэта І.Ф.Харламава, які выйшаў у Мінску пятым перапрацаваным і істотна дапоўненым выданнем.

Перш за ўсё ў падручніку пры інавацыйным выкладанні матэрыялу вытрымана класічная структура курса педагогікі як дысцыпліны для ВНУ.

Пачынаецца падручнік разглядам агульных пытанняў педагагічнай тэорыі. Ужо тут аўтару ўдалося адназначна абазначыць асобасна-арыентаваны статус свайго даследавання, адыходзячы ад рэцэптурнай характарыстыкі прадмета педагогікі як навукі аб арганізацыі навучання і выхавання школьнікаў. Выбраная аўтарам пазіцыя замацоўваецца і атрымлівае навуковую інтэрпрэтацыю ў главах "Асоба як прадмет выхавання" і "Сутнасць выхавання як педагагічнага працэсу". У іх даецца сацыяльна і генетычна дэтэрмінаванае тлумачэнне працэсу асобаснага развіцця вучняў пры вядучым і накіроўваючым значэнні выхаваўчых намаганняў настаўнікаў і бацькоў, раскрываецца дзейнасна-адносінная канцэпцыя выхавання, паказана роля актыўнасці чалавека ва ўласным развіцці. Усё гэта адпавядае аднаму з ключавых палажэнняў сучаснай тэорыі і практыкі выхавання, якая разглядае вучня не толькі ў якасці аб'екта педагагічных уздзеянняў, але і актыўнага суб'екта, эфектыўнае развіццё якога, як адзначае аўтар, працякае як працэс самаразвіцця і ажыццяўляецца шляхам уключэння вучняў у разнастайныя віды дзейнасці і стымулявання іх унутранага імкнення да самаўдасканалення.

Трэба адзначыць лагічную стройнасць падручніка, якая ў многім вызначаецца паказанай у І раздзеле цеснай узаемасувяззю працэсаў навучання і фарміравання ў вучняў сацыяльных і духоўных адносін (асобасных якасцей). Цалкам апраўданым з'яўляецца ўключэнне ў ІІ раздзел, які прысвечаны дыдактычным асновам школьнага навучання, спецыяльнай главы "Навучанне як працэс асобаснага развіцця вучняў і яго даследаванне ў дыдактыцы". У ёй па-новаму даецца вызначэнне сутнасці адукацыі як працэсу і выніку засваення вучнямі не толькі навуковых ведаў, практычных уменняў і навыкаў, але і звязаных з імі спосабаў разумова-пазнавальнай і творчай дзейнасці, светапоглядавых і маральна-эстэтычных ідэй.

Да істотных вартасцей падручніка трэба аднесці імкненне аўтара раскрыць псіхалагічныя механізмы авалодвання вучнямі зместам школьнай адукацыі. Такі падыход добра відаць у главах аб сутнасці працэсу навучання, яго метадах і формах арганізацыі. У прыватнасці, вызначаючы навучанне як важнейшую педагагічную катэгорыю, І.Ф.Харламаў акцэнтуе ўвагу на такіх яго прыкметах, як стымуляванне педагогам актыўнасці вучняў у працэсе іх вучэбна-пазнавальнай дзейнасці, развіццё памяці, мыслення і творчых здольнасцей, удасканальванне вучэбных уменняў і навыкаў і інш. На глыбокай псіхалагічнай аснове раскрываецца ўнутраная структура працэсу навучання.

Павышэнню прыкладнога значэння падручніка садзейнічае выкарыстанне фактаў са школьнай практыкі, асабліва з вопыту настаўнікаў гомельскіх СШ №№10, 28, 56 і інш. Шмат такога матэрыялу ў главах аб тэарэтычных і метадалагічных асновах навучання. У прыватнасці, у главе аб формах навучання шырока прадстаўлены метадычныя новыя ідэі вядомых настаўнікаў-наватараў В.Ф.Шаталава, Я.М.Іванова, І.П.Волкава. Усё гэта дазволіла пазбегнуць празмернай навукападобнасці, якая ўласціва асобным педагагічным дапаможнікам, аўтары якіх па тых або іншых прычынах адарваны ад жыцця школ і выкладчыцкай дзейнасці ў ВНУ.

Такое ж спалучэнне тэарэтычнай і метадычнай накіраванасці ўласціва і для ІІІ раздзела падручніка, у якім паслядоўна рэалізуецца канцэптуальная ідэя аўтара аб дзейнасным характары выхавання, яго накіраванасці на фарміраванне ў вучняў асобасных уласцівасцей і якасцей: маральных, эстэтычных, фізічных. Працэс іх развіцця раскрываецца прафесарам І.Ф.Харламавым з пункту погляду ўнутранай структуры асобаснай якасці, засвоўшы якую лёгка зразумець арганізацыйна-метадычную сутнасць выхаваўчай работы ў школе. Канкрэтнае ажыццяўленне структурна-арыентаваны падыход да фарміравання асобасных якасцей знайшоў у главах аб маральным выхаванні вучняў, развіцці ў іх патрыятызму і культуры міжнацыянальных адносін, працалюбства і дысцыплінаванасці, аб эстэтычным і фізічным выхаванні школьнікаў. Фактычна ўпершыню ў вучэбнай літаратуры па педагогіцы знойдзены адзіны падыход да арганізацыі выхавання, які лёгка рэалізуецца на практыцы і накіраваны на ўсебаковае развіццё вучняў.

Істотнай навізной адрозніваецца глава аб структуры дзейнасці настаўніка і яго прафесіянальным росце, якая змешчана ў раздзеле "Пытанні школазнаўства". У ёй выдзелены такія этапы станаўлення прафесіяналізму настаўніка, як педагагічнае ўмеласць, педагагічнае майстэрства, педагагічная творчасць і наватарства. Гэты, як і ўвесь матэрыял падручніка ў цэлым, будзе вельмі карысным для ўсведамлення будучымі і працуючымі ў школе настаўнікамі навукова-метадычных пытанняў школьнага навучання і выхавання.

Ф.КАДОЛ, дацэнт кафедры педагогікі.

# КИТАЙСКАЯ РЕФОРМА

***Чудес, как говорится, на свете не бывает. А в экономике — особенно.***

***Своими соображениями на этот счет решила поделиться на страницах нашей газеты пятикурсница экономического факультета ГГУ Чжан Жун Жун. Она рассказывает о достигшей в последние годы немалых успехов экономике своей страны, многое из которой можно было бы применить и у нас.***

В 80-ых годах XX века многие социалистические государства последовательно, одно за другим входили в период реформ. За многие годы, прошедшие с их начала, некоторые страны достигли блестящих успехов.

Китайская реформа точно сделала свой выбор — деревенскую семью, которая несла полную ответственность перед государством за землю. Так стимулировалась активность крестьян. Как сказал великий архитектор китайских реформ Дэн Сяо Пин: "Реформа начинается с крестьянина. Цель нашей реформы — возродить в каждом человеке ответственность за порученное ему дело, надо отказаться от "пищи из общего котла", стимулировать трудолюбие крестьян".

В Китае количество людей в аграрном секторе составляло 80% всего населения. Если успешно стимулировать активность крестьян, то можно решить вопросы удовлетворения потребностей населения в питании. Успехи реформ в аграрном секторе экономики могут составить надежный фундамент и для реформ в других областях экономики.

Россия же выбрала себе другой путь — изменение политического режима, а потом экономические реформы. Были отпущены цены в ситуации, когда не хватало товаров, в таких условиях начали проводить приватизацию, когда законодательство еще не закрепило право на землю. Поэтому уровень инфляции быстро вырос, а производительность предприятий упала.

**Использование стратегии реформ**

Реформа — это своего рода жесткая революция. Она касается экономики, политики, просвещения, интересов населения и ввиду этого обязательно возбуждает противоречия между группами людей. Поэтому умение использовать стратегию реформы — это очень важный элемент успеха. Цель китайской реформы представляет собой обеспечение основных интересов населения. Это значит, что, с одной стороны, население может чувствовать, что реформа дает им реальную пользу и, с другой — нельзя форсировать реформу.

Россия существовала в условиях плановой экономики 74 года, а Китай — 43 года. 74 года — это длинный срок, сменилось 3 поколения. Плановая экономика переходит на путь рыночной, а менять сознание руководителя — нелегкий вопрос.

**Отношение между реформой и открытой экономикой**

В Китае создание открытой экономики представляет собой основную задачу реформы. Здесь тоже достигнуты большие успехи. Созданы и успешно функционируют свободные экономические зоны.

К середине 90-х годов открылись более 5000 китайских предприятий за рубежом. Сумма инвестиций составила 5,16 млрд. USD в 120 странах и регионах.

**Отношение между реформой, открытой экономикой и стабильностью**

Как сказал Дэн Сяо Пин, Китаю нельзя быть шумным и беспорядочным. Экономика развивается только в стабильном и дружном обществе. Надо вытеснять из нашей жизни все то, что мешает нам пойти по пути социального развития.

Для Китая самой высокой целью является стабильность.

Какие же отношения существуют между стабильностью, динамикой развития и реформой?

Реформа представляет собой мобильное развитие экономики и производства. Она может представить надежные основы для обеспечения стабилизации.

Если бы не имели успеха реформы, то мы не смогли бы победить в революции (VI •IV) (студенческие волнения в Пекине в 1989 г.).

Почему после этой революции наша страна стала такой стабильной? Благодаря реформе и открытой экономике, стимулированию развития экономики и улучшению жизни населения. Поэтому: реформа — это мотивация; развитие — это цель; стабильность — это основание.

Как должны складываться отношения между ними? Следует использовать и динамику реформы, и скорость развития экономики, и высокую степень стабильности.

**Инвестиции**

Без инвестиций экономика не может развиваться. Существует их 3 формы: народные, правительственные, иностранные.

В России народные инвестиции почти отсутствуют, потому что у населения мало денежных вкладов в банках. А после недавнего кризиса нет и доверия к ним. Они сами хранят свои деньги или покупают иностранную валюту. В Китае, благодаря высокой ставке на вклады и привлеченным иностранным инвестициям, имеется большое количество оборотных средств.

Положительное сальдо внешней торговли в нынешнем году достигло 40 млрд. USD, а валютные резервы — 140 млрд. USD.

**Проблемы китайской экономики в будущем**

В 1978 году Китай начал экономические реформы и достиг больших успехов, повысился уровень жизни населения. Но из-за высоких темпов реформ возникло много вопросов:

1. Об эксплуатации государственных предприятий.

Сейчас 40% государственных предприятий стали убыточными. В 1996 г. китайское правительство выделило 69 млрд. юаней, чтобы заполнить дефицит государственных предприятий. Эта сумма соответствует 9,2% от общих финансовых расходов правительства в год.

2. Об инфляции.

С 1991 г. по 1995 год средний темп роста цен составил 11,4%.

3. О сельском хозяйстве.

Население Китая составляет 21% от общемирового населения, а площадь пахотных земель составила 7% от общемировой площади. С 1995 года темпы роста сельского хозяйства уменьшились из-за недостатка денежных вложений в него и повышения себестоимости продукции, что привело к уменьшению производительности и сокращению площади пахотных земель.

4. О занятости населения.

С 1985 до 1994 г. коэффициент безработицы увеличился и составил 2,8% в городах.

Но самой большой проблемой в Китае является возможное развитие экономики по японской модели.

Японские предприятия уже прошли стадию трений и конфликтов, поэтому в настоящее время, особенно в связи с кризисом в Юго-Восточной Азии, стала очевидной разница между Японией и Америкой. Значит, китайские предприятия так же, как и японские, ждут те же проблемы.

ЧЖАН ЖУН ЖУН,
студентка гр.ЭУ-53
экономического факультета.

*10 год з імем Ф.Скарыны*

# ТУТ ВУЧЫЎСЯ СКАРЫНА



З усіх гарадоў, дзе жыў, вучыўся ці працаваў наш славуты першадрукар, мне давялося пабываць толькі ў Полацку і Вільні. Праўда, тут з часоў Скарыны амаль нічога не засталося. Іншая справа Кракаў, Падуя, Прага і Калінінград (Крулявец). Здавалася, што там слядоў Скарыны больш. Марыў прайсці па ягонай дарозе да канца — да Прагі. І вось мара пачала збывацца.

Цэлых 30 дзён у кастрычніку г.г. пашчасціла мне дыхаць тым паветрам, хадзіць па тых вуліцах старога Кракава, вучыцца ў Ягелонскім універсітэце, якія натхнялі ў свой час Ф.Скарыну, узнялі яго на першую сур'ёзную прыступку ў чароўную і бясконцую краіну ведаў.

Гэтай шчаслівай магчымасці я абавязаны Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў, якую ўзначальвае дырэктар Нацыянальнага навукова-асветнага цэнтра імя Ф.Скарыны, доктар філалагічных навук, прафесар А.В.Мальдзіс. Ён пазнаёміў рэдакцыю польскамоўнага часопіса ў Парыжы "Культура" і яе дырэктара па публікацыях Ежы Гедройца з музеем-лабараторыяй Ф.Скарыны нашага універсітэта і з маімі артыкуламі пра Ф.Скарыну. Ежы Гедройц — даўні і заўзяты прыхільнік беларускай мовы і культуры, зацікаўлены ў навуковым развіцці скарыназнаўства. Імкнучыся папоўніць рады даследчыкаў творчай спадчыны Скарыны, стварыць лепшыя магчымасці для іх працы, ён пахадайнічаў перад старшынёй праўлення Таварыства апекі над Архівам Літаратурнага інстытута ў Парыжы Марэкам Краўчыкам аб выдзяленні мне месячнай стыпендыі для навуковай стажыроўкі ў Кракаўскім (Ягелонскім) універсітэце. Шаноўны Марэк Краўчык выканаў просьбу Ежы Гедройца і прыслаў афіцыйнае запрашэнне.

І вось я атрымаў сваю стыпендыю ў Варшаўскім офісе Таварыства і накіраваўся ў Кракаў.

Ва універсітэце пайшоў з усімі сваімі камандзіровачнымі дакументамі да прарэктара па міжнароднаму супрацоўніцтву, доктара габілітаванага, прафесара Марэка Шымоньскага. Пан прарэктар вельмі цёпла прыняў мяне, перадаў прывітанне не толькі рэктару нашага універсітэта Л.А.Шамяткову, але і вітаў увесь беларускі народ.

Інстытут усходнеславянскай філалогіі знаходзіцца недалёка ад галоўнага корпуса універсітэта. Ім кіруе доктар габілітаваны, прафесар Люц'ян Суханэк. З ім таксама атрымалася прыемнае для мяне знаёмства. Радасна ўсведамляць, што паміж намі ўсталяваліся прыязныя адносіны і перада мной раскрыліся светлыя перспектывы супрацоўніцтва з гэтым інстытутам і штоквартальным часопісам "Slavia Orientalis", які рэдагуе гэты паважаны прафесар.

Навуковыя вынікі стажыроўкі — тэма адпаведнага артыкула. Тут жа хочацца пазнаёміць студэнтаў і выкладчыкаў нашага універсітэта з гісторыяй Кракава і яго акадэміі да 1504 года, калі сюды прыехаў Скарына.

Кракаў — першая сталіца Польскай дзяржавы ў XI-XVI ст.ст., трэці горад краіны па колькасці насельніцтва. Узнік на месцы пасялення племя віслян у VIII-X стагоддзях. У часы Скарыны горад складаўся з каралеўскага замка на ўзгорку Вавель над Віслай, меў комплекс пабудоў, якія ўзводзіліся ў XIII-XVII ст. На поўнач ад узгорка размяшчаўся горад, які цяпер атрымаў назву Старэ мяста. У горадзе былі фрагменты ўмацаванняў канца XIII-XIV ст.ст. з надваротнымі вежамі і барбаканам (1498-1499), раманскі касцёл святога Андрэя, каля 1090 г., гатычныя касцёлы дзевы Марыі, каля 1360-1548 гг., у інтэр'еры якога вітражы канца XVI ст.; алтар, выкананы Вітам Ствошам у 1477-1489 гг. (размова пра яго будзе ісці асобна), памяшканне Кракаўскай акадэміі Калегіум Маюс (закончана ў XVст.), дамы ў стылі рэнесансу з прыгожымі атыкамі, скульптурнымі парталамі і аркаднымі ўнутранымі дворыкамі, найлепшае ўяўленне аб якіх дае захаваны да нашага часу даўні будынак акадэміі Калегіум Маюс.

**К.УСОВІЧ,**
**загадчык музея-лабараторыі Ф.Скарыны.**

**(Працяг будзе).**

# ДЛЯ АБІТУРЫЕНТАЎ ГДУ АБ УСТУПНЫХ ЭКЗАМЕНАХ-99

| №№ Спецыяльнасць | Экзамены |
|---|---|
| **1. Руская мова і літаратура** | 1. Руская мова (дыктоўка).<br>2. Руская мова і літаратура (вусна)<br>3.Беларуская мова і літаратура (вусна). |
| **2. Руская мова і літаратура са спецыялізацыяй "Беларуская мова і літаратура"** | 1. Руская мова (дыктоўка).<br>2. Руская мова і літаратура (вусна)<br>3. Беларуская мова і літаратура (вусна). |
| **3. Беларуская мова і літаратура** | 1.Беларуская мова (дыктоўка).<br>2. Беларуская мова і літаратура (вусна).<br>3.Руская мова і літаратура (вусна). |
| **4. Беларуская мова і літаратура са спецыялізацыяй "Англійская мова"** | 1.Беларуская мова (дыктоўка).<br>2. Англійская мова (вусна, з аўдзіраваннем і лексіка-граматычным тэстам).<br>3. Беларуская мова і літаратура (вусна). |
| **5. Англійская мова** | 1. Англійская мова (пісьмова).<br>2. Англійская мова (вусна).<br>3. Гісторыя Беларусі (вусна).<br>4. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне). |
| **6. Нямецкая мова** | 1. Нямецкая мова (пісьмова).<br>2.Нямецкая мова (вусна).<br>3.Гісторыя Беларусі (вусна).<br>4.Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне). |
| **7. Матэматыка** | 1. Матэматыка (вусна).<br>2. Матэматыка (пісьмова).<br>3.Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (пераказ). |
| **8. Бухгалтарскі ўлік, аналіз і аўдыт** | -//- |
| **9. Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве** | -//- |
| **10.Камерцыйная дзейнасць** | -//- |
| **11. Фінансы і крэдыт** | -//- |
| **12. Прыкладная матэматыка** | -//- |
| **13. Фізіка (вытворчае і педагагічнае аддзяленні)** | 1. Фізіка (вусна).<br>2. Матэматыка (вусна).<br>3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (пераказ). |
| **14. Фізіка з дадатковай спецыяльнасцю "Тэхнічная творчасць"** | -//- |
| **15. Фізічная электроніка** | -//- |
| **16. Аўтаматызаваныя сістэмы апрацоўкі інфармацыі** | -//- |
| **17. Геалогія і разведка карысных выкапняў** | -//- |
| **18. Гісторыя** | 1. Гісторыя Беларусі (вусна).<br>2. Замежная мова (вусна).<br>3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне). |
| **19.Гісторыя з дадатковай спецыяльнасцю "Англійская мова"** | 1. Гісторыя Беларусі (вусна).<br>2. Англійская мова (вусна, з аўдзіраваннем і лексіка-граматычным тэстам).<br>3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне). |
| **20. Правазнаўства** | 1. Гісторыя Беларусі (вусна).<br>2. Сусветная гісторыя (вусна).<br>3. Замежная мова (вусна).<br>4. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне). |
| **21. Геаграфія** | 1.Геаграфія (вусна).<br>2. Матэматыка (вусна).<br>3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (переказ). |
| **22. Экалогія** | 1. Геаграфія (вусна).<br>2. Матэматыка (вусна).<br>3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (пераказ). |
| **23. Псіхалогія** | 1. Матэматыка (вусна).<br>2.Біялогія (вусна).<br>3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (пераказ). |
| **24. Біялогія** | 1. Біялогія (вусна).<br>2. Хімія (вусна).<br>3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (пераказ). |
| **25. Фізічная культура і спорт (агульнапедагагічнае і спартыўна-педагагічнае аддзяленні)** | 1.Экзамен па спецфізпадрыхтоўцы.<br>2. Біялогія (вусна).<br>3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (пераказ). |

# СИМВОЛИКА ЗНАКА И СИГНЕТА ФРАНЦИСКА СКОРИНЫ



Существует много вариантов прочтения знака и сигнета С., выдвинутых различными авторами. Предлагаемая автором версия получена при помощи обычного метода иконологического анализа, дополненного, как и при анализе знаменитого портрета первопечатника, средневековой символикой букв и цифр, а также кирилицы.

В знаке "весы" из множества значений для нас интересны буквы Т— микрокосм-человек, и Д — учёный. Букву Т, символ человека, изобразил на плаще св. Антония И.Босх в своей картине "Искушение Св.Антония" (Мадрид). Астрологическое значение этой буквы — солнце. Итак, получаем значение знака: учёный человек подобен солнцу. В эпоху Скорины слово "ученый" понималось как человек, который знает об истинном знании.

Скорина жил в эпоху зарождения мощного движения пансофизма. В Праге в среде придворных гуманистов и художников получили большое распространение изображения Аполлона-Гелиоса. Позже в рудольфинскую эпоху они уступили место изображениям Минервы, символизирующей интеллект.

Сигнет Скорины с изображением солнца и луны, вероятно, аналог его личной печати врача. Существует латинское выражение "солнечное искусство (врачевания)".

Аполлон — повелитель болезней. Он же и Мусагет. По концепции Макробия, муза истории Клио руководит движением луны. В ту эпоху основным источником истории рода людского являлся текст "Библии". Начальная буква слова "солнце" в кирилице —слово, а луны — люди. "Слово людям". С — мировое существо, помощь, Л — воспитание, учёный. Солнце и луна символизируют получение и передачу знания, дисциплину и доктрину. В латинском языке слово дисциплина — почти синоним слова "знание". Примечательно встревание слова discipula в контекст: Luminis solis lunadis — cipula — подражательница, научившаяся чужому свету, чужесветящаяся. Рядом доктрина, доктор. Среди красивых названий докторов-Учителей той эпохи "светящийся" доктор, принадлежавшее автору "Великого искусства" — Р.Луллию. Идеограмма сигнета — помощь людям, духовное врачевание общества светом знаний, в том числе и истории рода людского. Сигнет — образное воплощение графического знака Скорины, понятен их постоянный "дуэт" в изданиях Скорины.

В заключение хочу обратить внимание читателей на близость начертания знака Скорины к знаменитому рисунку Леонардо да Винчи с изображением пропорций фигуры человека, вписанной в квадрат и круг. Автор уверен в близости скрытой идеограммы этого рисунка идеограмме знака Скорины — прекрасный, гармонически развитый учёный человек.

**Н.ПОЛКОВНИЧЕНКО,**
**преподаватель изобразительного искусства СШ №19.**

# О БЕДНОМ СПОРТСМЕНЕ ЗАМОЛВИТЕ СЛОВО

С удовлетворением прочел в газете "Гомельскі універсітэт" (№12 от 1 сентября с.г.) о расширении перечня победителей и призеров олимпиад различного уровня по общеобразовательным предметам, зачислявшихся в число студентов без вступительных экзаменов. Способности, проявляемые учениками в школьном возрасте, как правило, предопределяют возможность подготовки из их числа специалистов высокого профессионального уровня.

В число выпускников школ, имевших льготы при поступлении в университет, включены обладатели дипломов университетских олимпиад по физике и математике, школьные медалисты зачислялись по итогам собеседования на целый ряд специальностей и т.д. Даже занявшие 4-10 места на областных олимпиадах по ряду школьных предметов пользовались правами медалистов.

Думается, на спортивных соревнованиях международного и республиканского уровня победить столь же сложно и престижно, как и занять место в первой десятке на областной олимпиаде по теоретическому школьному предмету. Сделать это способны одаренные и хорошо подготовленные физически, технически и теоретически молодые люди.

На современном уровне спортивных достижений побеждать только за счет мускулов, без участия в этом процессе головы, невозможно, и в подавляющем числе случаев именно такие спортсмены и стоят на высшей ступеньке пьедестала почета. Сужу об этом как человек, 10 лет возглавлявший сборную команду республики по легкой атлетике.

Хотелось бы просить руководство университета рассмотреть вопрос о предоставлении льгот при поступлении абитуриентов — победителей республиканских первенств и призеров первенств Европы и мира по олимпийским видам спорта в своих возрастных группах на факультет физической культуры.

**По поручению коллектива кафедры легкой атлетики и лыжного спорта В.МИХАЛЕНЯ, доцент.**

# ЁН УЗНАЎЛЯЕ НАШЫ ТРАДЫЦЫІ

У нас на філфаку адбылася цікавая сустрэча з Мікалаем Фёдаравічам Макарцовым, рэжысёрам-пастаноўшчыкам рэспубліканскіх нацыянальных свят. На працягу адной гадзіны мы з вялікім захапленнем праслухалі змястоўныя расказы аб вялікіх рэспубліканскіх святах, якія праходзілі на баранавіцкай зямлі, у Тураве, Друцку, Оршы, Пінску, Мінску і іншых кутках Беларусі. Найвялікшую цікавасць выклікалі расказы аб 200-годдзі Адама Міцкевіча, Яна Чачота, 500-годдзі Мірскага замка, юбілеі Мінска, 600-годдзі Карэлічаў. Таксама Мікалай Фёдаравіч расказаў нам аб Паўлюку Багрыме, крашынскім кавалі. Да нас дайшоў толькі адзін верш яго, але аб ім напісалі цэлую кнігу. Яшчэ мы даведаліся аб планах рэжысёра на будучае.

У канцы сустрэчы ён прапанаваў нам свае кнігі "Каб не перасохла крыніца", "Тураўская легенда" і "Слова пра творцаў". Усе, хто набыў яго кнігі, таксама атрымалі аўтографы аўтара. Увогуле сустрэча атрымалася вельмі цікавай і змястоўнай.

**Алеся ШУЦІКАВА,**
**студэнтка гр.Б-12**
**філалагічнага факультэта.**



*Алексей ФЕСЬКОВ*

## РЫБКА ЗОЛОТАЯ

*Я поймаю*
*Золотую рыбку,*
*Ту, что прадед*
*Отпустил когда-то,*
*И с улыбкой*
*На ее улыбку*
*Придержу*
*Могучего собрата.*
*Стану сам*
*Богатым и веселым,*
*Одарю красавиц*
*Без оглядки,*
*Прогуляюсь*
*По уставшим селам,*
*Сам вскопаю*
*Под капусту грядки...*
*Неустанно*
*Стану ждать разлива*
*Близких к морю*
*Быстротечных вод,*
*По которым сказочно*
*Незримо*
*Приплывет та рыбка,*
*Приплывет!*

*Канферэнцыі*

# НА РУБЯЖЫ ТРЭЦЯГА ТЫСЯЧАГОДДЗЯ

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь сумесна з Брэсцкім дзяржаўным універсітэтам правялі навукова-практычную канферэнцыю "Светапогляд і навука на рубяжы трэцяга тысячагоддзя". Усяго на канферэнцыю было прадстаўлена 145 дакладаў, працавала 7 секцый, якія разглядалі розныя аспекты навукі, светапогляду, адукацыі, пытанні гуманітарных, прыродазнаўчых і фізіка-матэматычных навук. У яе рабоце прынялі ўдзел вядучыя вучоныя Рэспублікі Беларусь, Расіі, Украіны, Польшчы. На пленарным пасяджэнні былі заслуханы даклады: "Навука ў сучасным свеце" – доктара хімічных навук, акадэміка, прафесара Н.Я.Ярчака; "Перспектывы развіцця анатоміі раслін у трэцім тысячагоддзі" – доктара біялагічных навук, прафесара Яроміна; "Навуковая карціна свету і яе роля ў міждысцыплінарным сінтэзе ведаў" – доктара філасофскіх навук, прафесара Л.Ф.Кузняцовай. Асаблівую цікавасць выклікаў даклад доктара тэхнічных навук, прафесара, ганаровага члена міжнароднай Акадэміі прыкладной радыёэлектронікі В.Я.Аўяр'янава, які ў сваім выступленні закрануў пытанні гравітацыі, што зацікавілі яго 20 гадоў назад, прапанаваў новы погляд на Сонечную сістэму і Зямлю.

Ад нашага універсітэта на секцыі фізіка-матэматычных навук былі прадстаўлены даклады студэнтаў фізічнага факультэта С.Белавусавай і аўтара гэтых радкоў "Аб метадалогіі пазнання фізічнага свету", выкладчыцы Т.П.Жалонкінай "Фарміраванне навуковага светапогляду студэнтаў у працэсе выкладання прыродазнаўчых навук".

Канферэнцыя прайшла цікава, закранула грунтоўныя і важныя пытанні светапогляду, добра была прадумана і праведзена культурная праграма. Па выніках канферэнцыі выдадзены зборнік матэрыялаў.

**Н.ВОЛКАВА,**
**студэнтка IV курса**
**фізічнага факультэта.**

# ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА Ў ГІСТАРЫЧНЫМ АСПЕКЦЕ

10 снежня 1948 года аднагалосна была прынята Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека, што заклала асновы міжнародна-прававой абароны правоў чалавека, якімі мы кіруемся і сёння. У ёй замацаваны асноўныя правы асобы, якія належаць кожнаму чалавеку на Зямлі і ўключаюць у сябе грамадзянскія і палітычныя правы, а таксама шырокі спектр культурных, сацыяльных і эканамічных правоў (у тым ліку права на адукацыю, працу, адпачынак).

Пяцьдзесят гадоў назад свет сказаў: "Больш ніколі – жорсткасцям другой сусветнай вайны" і абвясціў, што кожны чалавек, незалежна ад таго, дзе ён жыве і чым займаецца, мае правы, якія павінны выконвацца пры ўсіх абставінах.

З часоў прыняцця Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека былі распрацаваны і прыняты многія іншыя міжнародныя пагадненні глабальнага і рэгіянальнага характару для забеспячэння дадатковай міжнародна-прававой абароны правоў чалавека. Напрыклад, у 1966 г. былі прыняты Міжнародны Пакт аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах, у 1984 г. з'явілася Канвенцыя супраць катаванняў.

У Еўропе дадатковымі прававымі механізмамі праваабароны служаць Еўрапейская Канвенцыя абароны правоў чалавека і асноўных свабод (1950) і Канвенцыя супраць катаванняў (1987), а таксама дзейнасць Еўрапейскага суда па правах чалавека. Аналагічныя пагадненні існуюць і ў Амерыцы, з'явіліся яны на іншых кантынентах. Тым не менш неабходнай асновай усіх прынятых у далейшым дакументаў застаецца Усеагульная дэкларацыя, таму 10 снежня 1998 года, калі адзначалася 50-годдзе яе прыняцця, стала надзвычайна важнай датай для сусветнай грамадскасці.

**В.БОРТНІК,**
**член Гомельскай ініцыятыўнай групы Міжнароднай Амністыі, выпускнік філфака ГДУ.**

*Пасля падзеі*

# СВЯТА СТУДЭНЦТВА

17 лістапада моладзь усяго свету адзначала свята – Міжнародны дзень студэнтаў. Мы былі запрошаны на першы рэспубліканскі фестываль, арганізаваны ў яго гонар. Наш універсітэт прадстаўлялі таксама 5 студэнтаў з КНР, якія вучацца на эканамічным факультэце.

І вось наш аўтобус прыпыняецца каля будынка канцэртнай залы "Мінск". Ужо тут адчувалася святочная атмасфера.

Перад пачаткам канцэрта ў холе была арганізавана мастацкая выстаўка народнай творчасці розных краін. Мы азнаёміліся з беларускай народнай творчасцю, а таксама Ірана, Каралеўства Непал, Лівана, Афрыкі і іншых краін. Тут жа журналісты беларускага тэлебачання бралі інтэрв'ю ў замежных студэнтаў – гасцей фестывалю.

Пасля невялікай афіцыйнай часткі адкрыцця фестывалю пачалося тэатралізаванае прадстаўленне, якое вялі вядомыя вядучыя беларускага тэлебачання Ларыса Грыбалёва і Ягор Хрусталёў. Першая частка канцэрта – выступленні замежных студэнтаў, якія атрымліваюць адукацыю ў Беларусі, сярод якіх гучалі песні студэнтаў КНР, курдскія народныя песні ў выкананні студэнтаў з Ісламскай рэспублікі Іран, спадабаўся ўсім ліванскі танец, танец "Бог Сонца" студэнтаў з Шры-Ланкі.

Поруч з замежнымі студэнтамі цудоўную праграму прадставілі студэнты з Беларускай дзяржаўнай політэхнічнай акадэміі (ансамбль "Каханачка", тэатр-студыя "Калізей", ансамбль "Дружба", балет "Безумный Макс", ансамбль народных інструментаў), а таксама КВЗ "Здаралася і горш" Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь.

У завяршэнні канцэрта для студэнтаў выступілі зоркі беларускай эстрады: Дзмітрый Смольскі, Андрэй Хлястоў, Ліка і іншыя. А пасля канцэрта ўсіх чакала маладзёжная дыскатэка, якая ўключала ў сябе праграму "Гульні народаў свету".

На працягу ўсяго вечара не змаўкалі жарты, віншаванні і пажаданні на розных мовах. Было вельмі прыемна бачыць столькі вясёлых твараў. Заснавальнікамі фестывалю было прапанавана праводзіць такія святы кожны год, што было падтрымана з вялікай ініцыятывай.

Карыстаючыся выпадкам, мы хочам падзякаваць рэктарат нашага універсітэта, а таксама асабіста арганізатара нашай паездкі прарэктара па культурна-асветніцкай рабоце А.В.Лысянкова. Мы атрымалі вялікае задавальненне ад гэтай паездкі, цёплых адносін і атмасферы свята.

**Аксана БАБАКОВА,**
**Вольга ІГНАЦЕНКА,**
**студэнткі II курса**
**фізічнага факультэта.**



*Зімовы горад.*

## ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

-- ВМ і праграміравання -- асістэнта;
-- бухуліку, кантролю і АГД -- дацэнта, асістэнта;
-- аўтаматызаваных сістэм апрацоўкі інфармацыі -- асістэнта;
-- правазнаўства -- асістэнта.

Тэрмін падачы заяў - не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г.Гомель, вул.Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты матэматычнага факультэта, кафедра фізвыхавання і спорту, спартклуб выказваюць глыбокае спачуванне намесніку дэкана матфака па выхаваўчай рабоце і спорту, старшаму выкладчыку **ГАЛАВАЧУ Уладзіміру Аляксандравічу** з выпадку напаткаўшага яго гора – смерці **МАЦІ**.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.
Зарэгістравана ў Дзяржкамдруку 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на фабрике "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1.

Рэдактар Ул.П.БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 552
Падпісана да друку 4.12.98.